# ХРОНІКА МІНСКА ЗА 1940 ГОД

На календарных старонках 1940 года запісана многа слаўных перамог.

Сталіца БССР—г. Мінск—узбагацілася новымі прадпрыемствамі, прыгожымі школамі, комунальнымі будынкамі.

Нанава адбудаван і прыгожа аздоблен мінскі вакзал. Па архітэктуры і ўнутранай аздзелцы ён займае адно з першых месц у Совецкім Саюзе.

На былой забалочанай акраіне — Камароўцы—высяцца найлепшыя будынкі горада. Сярод іх манументальны будынак Акадэміі навук БССР з каланадай, светлы клінічны гарадок, політэхнічны інстытут.

Уступіў у строй новы радыёзавод. Учора з канвеера завода сышло 60 новых радыёпрыёмнікаў «КІМ» і «Піонер». Горад узбагаціўся новай культурнай установай—Карціннай галерэяй. Тут 8 лістапада адкрылася выстаўка — «Ленін і Сталін — арганізатары БССР». За 50 дзён выстаўку наведала звыш 8 тыс. чалавек.

Адным з буйнейшых кнігасховішчаў у Саюзе з'яўляецца мінская Цэнтральная бібліятэка імені Леніна. Кожны дзень сюды прыбываюць пасылкі з кнігамі, якія выдаюцца ў Совецкім Саюзе і за мяжой. За год атрымана 96.217 тамоў, у тым ліку 2.776 кніг з Кітая, Японіі, Германіі, Амерыкі. У мінулым годзе бібліятэку наведала 318.252 студэнты, навуковыя работнікі, рабочыя і служачыя. Ім было выдана 565.436 кніг.

Каля 2 тысяч чалавек атрымалі вышэйшую асвету ў сценах 8 вышэйшых навучальных устаноў сталіцы.

Разам з ростам матэрыяльнага дабрабыту расце і культура працоўных. Тэатры горада наведала больш 500 тыс. чалавек, у тым ліку Тэатр Оперы і балета каля 150 тысяч. 2,5 млн. чал. пабывала ў кінотэатрах.

Вялікімі дасягненнямі сустракаюць новы год фізкультурнікі сталіцы. У іх балансе—40 новых рэкордаў па лёгкай атлетыцы. Штангісты ўстанавілі 6 рэкордаў, з іх адзін — сусветны.

Многа новых рэкордаў устанавілі плаўцы, конькабежцы, лыжнікі. 6 мацнейшых фізкультурнікаў горада атрымалі званне майстроў спорта.

Да паслуг працоўных сталіцы БССР — трамвай, аўтобусы, таксі. За 366 дзён трамваем перавезена 48.300 тысяч пасажыраў.